для всего проекта создания крупных тюркских формирований в рамках СС, он долго обсуждался всеми ответственными лицами и инстанциями и во многом способствовал падению активности в дальнейшем развитии ВТБС.

В марте 1945 в состав Восточно-тюркского соединения СС была включена Азербайджанская боевая группа. По другим сведениям, азербайджанская боевая группа еще в январе была выделена в состав особого Кавказского соединения СС, куда также вошли национальные подразделения грузин, армян и северокавказских горцев [5].

В конце войны соединение было переброшено на Балканы, а в апреле – дислоцировано в Ломбардии.

Таким образом, можно констатировать, что усилия СС по созданию формирования из тюркско-мусульманских народов СССР не привело к ожидаемому результату. Какие-то его составные части (командование, штаб, некоторые военные подразделения) действительно были сформированы и даже участвовали в военных операциях, но в целом ВТБС, так и не превратилось в организованную, боеспособную единицу.

**Список цитированных источников**

1. Гилязов И. А. Легион «Идель-Урал» / И. Гилязов. – М.: Вече, 2009. – 304 с.
2. Каращук, А. Восточные легионы и казачьи части в вермахте / А. Каращук, С. Дробязко. – М.: АСТ, 2000. – 48 с.
3. Бриман, Ш. Мусульмане в СС / Ш. Бриман – [Электроный ресурс] http://gazeta.rjews.net/Lib/briman/5-briman.shtml,l – Дата доступа: 8.05.2015.
4. Романько, О.В. Мусульманские легионы во Второй мировой войне / О.В. Романько. – М.: АСТ, 2004. – 314 с.
5. Окторино, Н. Гитлеровские легионы советских мусульман [Электронный ресурс] http://www.liveinternet.ru/users/4198118/post185660829/ – Дата доступа: 7.05.2015.

УДК 692.12

***Хівук Д.***

***Навучны кіраўнік: загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры, к.ф.н. Н.Н. Борсук***

## ЛЕГЕНДАРНАЕ ЯНАВА: АДМЕТНЫ РЭГІЁН БЕРАСЦЕЙСКА-ПІНСКАГА ПАЛЕССЯ

Янава – адметны рэгіён Берасцейска-Пінскага Палесся. Асаблівасць сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця мястэчка ў XVIII – пач. XX ст. была звязана з распаўсюджаннем сярод мясцовых жыхароў рэдкага занятку. Ён заключаўся ў збіранні ахвяраванняў на царкву. Янаўцы, якія гэтым займаліся, называліся лабарамі. Амаль усе мужчыны-хрысціяне мястэчка былі ўцягнуты ў гэты промысел. Невыпадкова ў свядомасці жыхароў акругі словы янавец і лабар сталі сінонімамі.

У XIX ст. збор ахвяраванняў на рамонт і будаўніцтва храмаў быў звычайнай з'явай. Яшчэ на пачатку XX ст. на сельскіх кірмашах, на пастаялых дварах і ў іншых шматлюдных месцах можна было сустрэць сялян, мяшчан, манахаў,

адстаўных салдат, якія гэтым займаліся. У рознай мясцовасці іх называлі па-рознаму: прашакамі, лабарамі, кубракамі.

Адносна паходжання слова «лабар» існуюць розныя пункты погляду. Сярод жыхароў Іванава сёння найбольш распаўсюджана ўяўленне аб утварэнні яго ад імя памешчыцы Лабарыні. Існавала ці не легендарная Лабарыня – невядома. Аднак больш верагодным здаецца меркаванне, што назва «лабар» паходзіць ад лацінскага labor – праца. Зборшчыкаў ахвяра-ванняў на карысць царквы ксянзы маглі называць працаўнікамі, вымаўляючы гэта па-лацінску.

Па нашым перакананні, янаўскія лабары па этнічнай прыналежнасці, несумненна, былі палеска-беларускім насельніцтвам. Хаця ў самім горадзе захаваліся звесткі, што некалі даўно гаспадар Янава перасяліў сюды некалькі чалавек што з-пад Луцка, ці то з Малдавіі, якія, уласна кажучы, і былі першымі лабарамі. Нават калі гэта і мела месца, за сотні гадоў перасяленцы сталі сапраўднымі палешукамі, хаця і карысталіся яны штучнай тайнай мовай.

Прычына ўзнікнення гэтай мовы, як і іншых штучных моў, заключаецца ў жаданні некаторых груповак грамадства захоўваць свае прафесійныя сакрэты. На тэрыторыі Беларусі, напрыклад, існавалі штучныя мовы крычаўскіх рамеснікаў, дрыбінскіх шапавалаў, жабракоў Слуцкага і Гомельскага паветаў Магілёўскай губерні, кубракоў Мсціслава і інш. Вывучэннем гэтага пытання займаўся фальклярыст Е. Раманаў.

Мова янаўскіх лабараў блізкая да мовы жабракоў і кубракоў (нагадаем, што апошнія таксама займаліся зборам ахвяраванняў на царкву).

Пасля ўтварэння БССР і СССР лабары, якія апынуліся ў складзе Польшчы, страцілі магчымасць ездзіць на ўсход па ахвяраванні. Кола іх вандровак значна звузілася. А пасля 1939 г. лабарства як інстытут увогуле знікла. У Савецкай Беларусі адбывалася масавае закрыццё храмаў, і будаваць новыя ўмоў зусім не было. Прафесійныя зборшчыкі сродкаў на царкву засталіся без занятку.

Дваццатае стагоддзе прынесла ў жыццё Янава шмат новага. Асаблівасці культуры і быту, псіхалогіі лабараў паступова нівеляваліся на карысць поўнага збліжэння з рысамі новых перасяленцаў з навакольных вёсак. З канца XIX па канец XX ст. колькасць жыхароў горада павялічылася з 3 тыс. чалавек да 16 тыс. У наш час доля нашчадкаў лабараў сярод агульнага насельніцтва Іванава зусім невялікая. І даўно ўжо ніхто не займаецца зборам ахвяраванняў на будаўніцтва храмаў, а значыць, і не з'ўляецца лабарам у літаральным сэнсе слова.

Тым не менш, распаўсюджаныя назвы мястэчак, прозвішчы, мянушкі на тэ-рыторыі Берасцейска-Пінскага Палесся нагадваюць аб адметнай групе насель-ніцтва гэтага рэгіёну і іх занятку (сабраны матэрыял прыводзіцца ніжэй).

Мы вельмі ўдзячны тым людзям, якія нам дапамаглі ў зборы матэрыялу: Базюку Леаніду Сцяпанавічу, Мікітчук Таццяне Васільеўне, Куліч Таццяне Маркаўне, Беразоўскаму Рыгору Віктаравічу, Лагодзічу Федару Аляксандра-вічу, а таксама супрацоўнікам Іванаўскай раённай бібліятэкі імя Ф. Панферава.

Анонии
Бадэлы
Безносьи(Безноска)
Белки (Жучки)
Броньки
Булии
Бэзы
Бэндыси
Вайтэры (Таранды)
Вовки
Вырымии
Гайшыны
Гарагулцы
Гембары
Генюши
Гооломы
Голубы
Грицы
Грои
Грыцуки (Грышуки)
Гуюны
Гуки
Демиды
Демьянченки
Джаламы
Джираны
Дзюманы
Дятлы
Зайцы
Зозули
Евдокимы
Ёси
Кабули
Калабунскии
Калэныки
Каплуны
Канистраты
Кебиси
Кити (Ките)
Кодыши
Козаризы
Кошки
Коцюбы
Кудлики
Куртатыи
Лахмаи
Левки
Лепушки
Лэси
Люльки
Ляши
Макаровы
Маласаи
Малафии
Малявы
Маркешовы
Марчуки
Мартыны
Марэги
Махтодыи
Медки
Мельники
Мережи
Михалечки
Михали
Мырки
Мэйты
Мэтки
Ныхваси (Оныхваси)
Омеляны
Патэли
Пацюры
Пенточки
Полковники
Пшэки
Пырожки
Пэпки
Пэти
Пэгэты (Пытэты)
Пылыны
Пэши
Ромаси
Рушаи (Рушаевы)
Саверайки
Санаторы
Сасайки
Сиры
Снытиры
Спиридоны
Стрыхи
Ступы
Столяровы
Сулимы
Сымонки
Талимоны
Тараньки
Халюки
Хламыды
Цары (Царики)
Цюшьки (Кудловичи)
Цыганы
Чабаны
Чварцы
Чигры
Шалабаны
Шахмонки
Шкляныи
Шовковы
Шостаки
Шпаки
Шпыруки
Шудры
Щупаки
Хомки
Хуторы
Янки
Ярмоны

**Распаўсюджаныя прозвішчы**

Базюк
Бегоза
Березовские
Гордашук
Дорогокупец
Жур
Зыбенок
Кудлович
Кулина
Кулич
Масальские
Микитчук
Сегень
Хала
Тупица
Туцкие

**Мянушкі на аснове прозвішчаў**

Базюки
Бегозы
Бэнды
Березовские
Горупы
Журы
Масальскии
Сегени
Хмелевскии
Ячмени

**Мянушкі на аснове імёнаў і імёнаў па бацьку**

Барбары
Кузьмины
Левковы
Самсоны
Сыдоры

**Мянушкі, якія з'явіліся адносна нядаўна**

Горупешка
Джульбик
Маюста